УДК 811.161.3’37(045)

**А. В. Семянькевіч** (Мінск)

# СЕМАНТЫЧНАЯ ТЫПАЛОГІЯ АБСТРАКТНЫХ МНОЖНАЛІКАВЫХ НАЗОЎНІКАЎ У БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

На працягу доўгага перыяду вывучэння праблематыкі субстантыўнага ліку сутнасць яе тэарэтычных канцэпцый шмат у чым вызначала інтэрпрэтацыя з’явы pluralia tantum (далей plt). У даследаваннях апошняга часу многія дыскусійныя пытанні статусу катэгорыі ліку страцілі сваю актуальнасць, бо змяніўся пункт гледжання на прыроду граматычнага значэння. З аднаго боку, лінгвістыка свядома адмовілася ад жорсткіх меж у вылучэнні і класіфікацыі моўных з’яў. З другога боку, у тэорыі граматыкі быў абвешчаны прынцып вытлумачальнасці, а кагнітыўныя падыходы паставілі задачу вызначыць, якія параметры пазнання навакольнага свету граматыкалізуюцца ў натуральнай мове. Дыскурсіўна скіраваныя даследаванні форм ліку паказалі, што фармальны погляд на субстантыўную лікавую парадыгму, які знаходзіў апраўданне ў тым, што «назоўнікі з выражаным супрацьпастаўленнем паводле ліку складаюць асноўную масу назоўнікаў» [11, с. 471], не знаходзіць пацверджання. Аўтары «Тэорыі функцыянальнай граматыкі» паставілі пад сумненне гэта агульнапрынятае аксіяматычнае палажэнне і выказалі меркаванне, што яно заснавана хутчэй на інтуіцыі, чым на даных статыстычнай базы, таму колькасную праблему, «якія імёны найбольш тыповыя: злічальныя ці пазбаўленыя гэтай здольнасці, наўрад ці трэба лічыць вырашанай» [14, с. 183]. Кваліфікацыя некарэлятыўных назоўнікаў як «anomalia сярод безумоўных назоўнікаў» [10, с. 393], як слоў, «якія пацярпелі аварыю» [7, с. 67], не можа задаволіць сучасную навуку, бо на першае месца выходзіць пытанне аб прычынах непаўнаты парадыгмы ліку. Усе «граматычныя цяжкасці» тлумачэння адзіночналікавых і множналікавых назоўнікаў, якія, на думку А. А. Рэфармацкага, «цікавыя хутчэй для стылістыкі, чым для граматыкі» [10, с. 393], пачынаюць з перыферыі даследавання пераходзіць у цэнтр.

У сучаснай граматыцы сцвердзілася палажэнне аб мнагафактарнасці прычын лікавай некарэлятыўнасці і прынцыповай магчымасці іх выявіць і растлумачыць. Адным з фактараў з'яўляецца іх семантыка. У беларускім мовазнаўстве стратэгіі семантычных аб'яднанняў назоўнікаў plt не даследаваны, што стварае пэўную лакуну ў асэнсаванні іх месца ў граматычнай сістэме мовы.

Аб'ектам аналізу ў гэтым артыкуле сталі беларускія абстрактныя плюратывы. Даследаванне праведзена на матэрыяле 530 лексічных адзінак, выбраных з 18 лексікаграфічных крыніц. Фармальным крытэрыем вылучэння абстрактных plt з'яўляецца іх уласцівасць называць незлічальныя рэферэнты. Лінгвістычная катэгорыя прадметнасці, якая лічыцца анталагічнай асновай назоўніка, аб'ядноўвае ў паняцці «прадмет» субстантыўныя назвы двух тыпаў – прадметы анталагічныя, якія характарызуюцца матэрыяльнай асобнасцю, выразнай вылучанасцю з кола іншых прадметаў, і прадметы гнасеалагічныя, якія называюць уласцівасці, адносіны, дзеянні. Асобнасць, адмежаванасць, індывідуальнае існаваннне ў прасторы і часе прадметаў першага тыпу з'яўляюцца ўмовай іх злічальнасці. Дэнататы прадметаў другога тыпу, якія становяцца «прадметамі» толькі ў пазнанні, у моўнай семантыцы, пазбаўлены адасобленасці і магчымасці злічэння. Аўтары «Тэорыі функцыянальнай граматыкі» лічаць, што «менавіта дыскрэтнасць/недыскрэтнасць шмат у чым вызначаюць спецыфіку канкрэтных/абстрактных імёнаў як катэгорый моўнага адлюстравання свету» [14, с. 192]. З філасофскага пункту гледжання «да абстрактных адносяць назоўнікі, дэнататы якіх маюць рэферэнты, якія не валодаюць прасторавай акрэсленасцю і/ці тактыльнай успрымальнасцю», а з пункту гледжання семантыкі «як абстрактныя вызначаюцца назоўнікі, якім адпавядаюць паняцці дзеяння, уласцівасці, якасці, стану» [5, с. 15]. Кагнітыўна-прагматычная значнасць абстрактных назоўнікаў заключаецца ў тым, «каб даць імя нематэрыяльным існасцям» [6, с. 66]. Множналікавыя абстрактныя назоўнікі могуць называць практычна ўсе «нематэрыяльныя існасці» (ідэі), якія прыпісваюцца і некарэлятыўным формам адзіночнага ліку, у прыватнасці называць: а) адцягненае дзеянне (*скокі, пераглядзіны*); б) адцягненыя пачуцці ці стан (*зайздрыкі, дрыжыкі*); в) адцягненае паняцце, якое існуе толькі ў чалавечым мысленні і якое нельга прадставіць наглядна (*веды, мудрыкі*). Аднак нашы назіранні паказваюць, што, у адрозненне ад абстрактных адзіночналікавых, назоўнікі plt не намінуюць адцягненую прымету. Семантычная структура абстрактных плюратываў характарызуецца полісемнасцю і аморфнасцю, таму іх таксаномія вызначаецца меншай дыферэнцыяльнай акрэсленасцю класіфікацыйных рубрык (у параўнанні з канкрэтнымі, зборнымі і рэчыўнымі). Сярод беларускіх абстрактных plt можна вылучыць наступныя.

1. **Назвы абстрактных паняццяў** (254 адзінкі), напрыклад: *абста́віны, адно́сіны, веды, выкладкі, гарызонты, гулі, дамовіны, дрыжыкі, жадункі, забабоны, зайздрыкі, залёты, захады, капрызы, кепікі, лёстачкі, мудроты, нервы, пералёкі, прыцемкі, раздабары, складанасці, стасункі, сховы, узаеміны, упікі, хаханькі, шашні*. У гэты таксон уключаюцца разнародныя па семантыцы словы, якія называюць нематэрыяльныя паняцці. Тым не менш сярод іх можна вылучыць пэўныя семантычныя групоўкі, якія дэманструюць дзеянне механізма намінатыўнай аналогіі. Гэта словы, што даюць неадабральную ацэнку паводзінам, характару чалавека, яго ментальнасці (*брындзікі, выкрутасы, вымудры, выробы, вытрыбенькі, выхітры, вычвары, вычуды, гарэзы, гнявы, гулі, гулюшкі, даліманы, дзівоты, зайздрыкі, закабунькі, залёсткі, дуды, дурыкі, жадункі,*

*капрызы, лабунькі, лалы, лёсткі, малімонікі, мудрыкі, наравы, песты, подбегі, прыштукі, пярэбары, разінькі, убегі, упіры, хітрыкі, шалы*) або жыццёвай сітуацыі (*дзіркі, злыдні, канцы, недахваткі, незадáлы, нелады, непамыслоты, непярэ́ліўкі неўкладушкі, неціхоты, нягоды, пераліўкі, церні)*; назвы ўзаемаадносін і ўзаемадачыненняў людзей, большасць таксама з неадабральнай ацэнкай (*абыходзіны, адносіны, вузы, зводы, зводні, зносіны, контры, любошчы, падседы, прошукі, стасункі, узаемаадносіны, узаемастасункі, узаеміны, узаемаразлікі, умызгі, упады, фіглі, фіглі-міглі, чэчні, шашні, шуры-муры*); словы, якія негатыўна ацэньваюць спосаб камунікацыі паміж людзьмі і самі выказванні (*байкі, біліндрасы, жартачкі, гудкі, галасы, казалы, кепікі, кеплі, кленічы, клятбоны, кпіны, кпінкі, крыватолкі, нападкі, падшэпты, пераводы, перагазы, перасмешкі, погудкі, прыпікі, прыпінкі, прытычкі, разгалосні, раздабары, размовы, смешачкі, смешкі, стрычкі, талабáсы, тары-бары, упікі, упінкі, хаханькі, хіхоты, шкелі, шэпты*); назвы стану, псіхічных і фізіялагічных адчуванняў чалавека негатыўнага характару, а таксама захворванняў (*дрыгі, дрыжыкі, злёкі, піралёкі, пранцы, пярэпалахі, курчы, лёкі, рэгулы, сухоты, схваткі, уздýхі, узры́гі*); колькасныя і тэмпаральныя паняцці (*дзясяткі, дні, мірыяды, сотні; гадзіны, зацемкі, павадкі, паўгодкі, паўдзёнкі, прыцемкі, поцемкі, прымеркі, пеўні, ранкі, рачанцы, суцемкі, суцінкі, халады, часы*). Як бачна з пералікаў, значная частка множналікавых назоўнікаў, якія называюць абстрактныя паняцці, мае ў сваёй семантычнай структуры ацэначны (пеяратыўны) кампанент.

Галоўнай лексікаграфічнай праблемай рэпрэзентацыі абстрактных plt з'яўляецца ацэнка аўтаномнасці і ўзуальнай значнасці плюральна аформленага значэння назоўніка. Група абстрактных множналікавых назоўнікаў актыўна папаўняецца шляхам семантычнай дэрывацыі (*гарызонты, магчымасці, абавязкі, віды, манеры, нервы, поспехі, формы, сувязі, вучэнні, дзіркі, гімалаі* і інш). Многія даследчыкі рускай неалогіі канца XX ст. адзначаюць «узмацненне грамемы множнасці», якое праяўляецца ў тым, што патэнцыйныя формы множнага ліку становяцца рэальнымі [12; 16; 1]. Праўда, трэба заўважыць, што гэта тэндэнцыя суіснуе і з адваротна накіраванай. У працах Л. А. Брусенскай [3] і В. М. Чараднічэнка [15] прыводзяцца спісы слоў, якія, насупраць, страцілі звычайныя ў XIX ст. формы множнага ліку (напрыклад, *пользы, кручины, борьбы* і пад.). У беларускім мовазнаўстве гэта праблема ў дыяхранічным аспекце не даследавана. З'ява плюралізацыі ў сістэме абстрактнай лексікі патрабуе дэтальнага аналізу рэферэнцыяльных характарыстык слоў, тыпаў кантэкстаў, сінтагматычных сувязей, модусных функцый і іншых фактараў, тым не менш нашы назіранні паказваюць правамернасць вядомага палажэння аб здольнасці абстрактных назоўнікаў перадаваць у форме множнага ліку семантыку разнароднасці, гетэрагеннасці і паўтаральнасці.

2. **Абстрактныя назвы дзеяння** (139 адзінак), напрыклад: *абыходзіны, адведзіны, водведы, выбары, выведы, дакопіны, дэбаты, закладзіны, зборы, манеўры, народзіны, паводзіны, пераведы, перамовіны, распыты, розведы, скокі, уцёкі* і інш. У таксон уключаны плюратывы з архісемай працэсуальнасці. Гэтыя назоўнікі кансалідуе аддзеяслоўнае паходжанне, што вызначае іх семантыку (нязначную па колькасці групу складаюць словы, утвораныя на аснове семантычнага пераносу: *манеўры, музыкі, эвалюцыі, эцюды*). Найбольшую «працэсуальнасць» выяўляюць субстантывы, якія семантызуюцца з выкарыстаннем формулы 'дзеянне паводле пэўнага дзеяслова', напрыклад: *выведы* 'дзеянне паводле дзеясл. *выведваць*'; *пярэбары* – 'дзеянне паводле дзеяслова *перабі-*

*рацца*'. Аднак такіх плюратываў вельмі няшмат, што гаворыць аб тым, што семантыка дэвербатываў plt у большай ступені спецыялізуецца ў параўнанні з адзіночналікавымі назоўнікамі. У дачыненні да множналікавых працэсуальных намінацый часта ўжываюцца характарыстыкі, якія вызначаюць іх спецыфіку: «дзеянне са значэннем працягласці ці паўтарэння» [9, с. 81], «дзеянні, працэсы, што адбываюцца працягла або выконваюцца многімі» [2, с. 63]; «працяглая ў часе акцыянальная структура» [8, с. 23]. Узнікае заканамернае пытанне: ці з'яўляюцца пералічаныя вышэй характарыстыкі сапраўды спецыфічнымі для абазначэння плюральна аформленага дзеяння ў адрозненне ад сінгулярна аформленага? Для таго каб адказаць на гэта пытанне, трэба найперш разабрацца з самім тэрмінам «дзеянне». У лінгвістычнай літаратуры выказаны спробы ўсе незлічальныя plt аб'ядноўваць у адзін клас «складаных дзеянняў» [13, с. 147–153; 8, с. 19]. На нашу думку, нават умоўнае разуменне гэтага тэрміна ('усё, што не прадмет') значна ўскладняе (пры здавалася б, наадварот, простай класіфікацыйнай сістэме) таксанамічную карціну множналікавых назоўнікаў, не вызначае спецыфіку плюратываў у дачыненні да злічальнасці/незлічальнасці і адпаведна іх сінтагматыкі, не дае магчымасці ацаніць прадуктыўнасць тэматычных груп. Акрамя таго, тэрмін «складанае дзеянне» закліканы дыферэнцаваць «складанае» і «нескладанае» дзеянне. Сапраўды, у семантычнай структуры множналікавых дэвербатываў прысутнічае кампанент 'працяглае, або паўтаральнае дзеянне, або дзеянне, якое выконваецца многімі', але гэты кампанент у многіх выпадках мініфестуецца не плюральнай флексіяй, а лексічным значэннем назоўніка, якое дэтэрмінуецца семантыкай утваральнага дзеяслова, дзе яго носьбітам з'яўляецца прыстаўка і аспектна-таксіснае значэнне. Пра гэта сведчыць шырока прадстаўленая ў беларускай мове сінанімія дэвербатываў plt і sgt (напрыклад, *выведы – выведванне*, *перашэпты – перашэптванне*, *даследзіны – даследаванне* і інш.). Лікавыя паводзіны дэвербатываў залежаць ад цэлага комплексу рознаўзроўневых фактараў, якія патрабуць глыбокага аналізу, апісання і сістэматызацыі, але нават нешматлікія прыклады паказваюць, што значэнне «складанага» дзеяння ўласціва не толькі прэдыкатным plt, таму лічыць гэты кампанент іх семантыкі адзіным фактарам плюральнай аформленасці ва ўсіх выпадках наўрад ці правамерна.

Некаторыя абстрактныя назвы дзеяння, аформленыя плюральна, выяўляюць магчымасць прадметнай інтэрпрэтацыі (напрыклад, *ад'ездзіны, даследзіны, запросіны*). Ускладненне іх семантычнай структуры адбываецца па мадэлі рэгулярнага пераносу 'дзеянне → вынік дзеяння'.

Перыферыйную зону працэсуальных плюратываў складаюць тэрміналагічныя назвы, прадстаўленыя адзінкавымі словамі (3 адзінкі): *настыі, сейсманастыі, хеманастыі.*

3. **Назвы свят, урачыстасцей, мерапрыемстваў, абрадаў і народных звычаяў** (99 адзінак), напрыклад: *агледзіны, адведкі, асяніны, бабі́ны, выправіны, грамніцы, дажынкі, дзевяціны, дзяды, жальбі́ны, загавіны, задушкі, закосіны, замовіны, запо́іны, зару́чыны, змовіны, імяніны, Каласавіны, ксціны, кучкі, мярліны, Пакровы, паховіны, пацалуйкі, пераловіны, перапоўзіны, прыкалядкі, саракавіны, уваходзіны, угаворыны, угледзіны, угодкі, улазіны, хаўтуры, хрысціны, хрэсьбіны, шасціны, шлюбавіны, шчадроўкі.* Колькасны склад гэтых намінацый значна павялічыцца, калі браць пад увагу рэгіянальныя назвы (напрыклад, *абжынкі, ачэпіны, басюры, калінкі, камаедзіцы, крыжавіны, кудзельніцы, лазбіны, макрэні, маладзены, мядзіны, пагрэбіны, падвяселіны, патрусіны, пахмелкі,*

*пірагі* і інш.). Гэтай тэматычнай групай часта прэзентуюць клас множналікавых незлічальных назоўнікаў як найбольш характэрных паводле семантыкі і найбольш старажытных па паходжанні [4, с. 58]. Функцыянальная значнасць адзінак гэтага таксона дэтэрмінуецца экстралінгвістычнымі фактарамі, многія ў слоўніках маюць памету *этн.* Аднак паводле гэтага намінатыўнага стандарту быў утвораны саветызм *Акцябрыны*, а пазней слова *Каласавіны* 'мерапрымствы ў гонар Якуба Коласа'. Адзначаны выпадкі аўтарскіх неалагізмаў, утвораных паводле словаўтваральнай мадэлі гэтай намінатыўнай групы, напрыклад: *Стаяць дрыготкія асіны, трапечуць лісьцем, Спраўляла восень* ***атрасіны*** *і вецер свішча. Згуляла восень* ***атрасіны*** *– чакай марозаў* (А. Кудласевіч).

Некаторыя назвы дзеяння маюць у семантычнай структуры і працэсуальнае значэнне, і абрадавае, якое ўзнікае ў выніку рэгулярнага пераносу 'назва сельскагаспадарчай дзейнасці' → 'назва абраду, якім яна суправаджаецца' (напрыклад, *дажынкі, абжынкі, закладзіны*). Калі абрадавыя назвы набываюць акцыянальнае значэнне пэўнай сітуацыі, яны могуць станавіцца злічальнымі, напрыклад: *сёння ў вёсцы двое хрысцін.*

4. **Назвы гульняў** (21 адзінка), напрыклад: *бірулькі, біткі, гарадкі, гарыпні, гарэлкі, даганялкі, дагонкі, жмуркі, карты, класікі, класы, ладачкі, ладкі, нарды, паддаўкі, снежкі, фанты, хованкі, хоўкі, шахматы, шашкі.* Большасць слоў утворана па метанімічнай мадэлі пераносу значэнняў на аснове сумежнасці паняццяў 'тое, з чым гуляюць (многа прадметаў)' → 'назва гульні'; дэвербатывы ўтварыліся з дапамогай марфемных сродкаў, але з захаваннем плюральнай формы вытворных. Назвы гульняў, утвораных іншымі спосабамі (напрыклад, на аснове метафары), маюць форму адзіночнага ліку (напрыклад, *гуляць у млын, вузельчык, вядзьмар, рэдзьку* і інш.).

Такім чынам, таксанамічную карціну абстрактных plt можна прадставіць наступным чынам (малюнак).

Абстрактныя plt

| Назвы абстрактных паняццяў<br>(48,1 %)<br>*выхітры*<br>*жадункі*<br>*мудрыкі*<br>*нягоды* | Абстрактныя назвы дзеяння<br>(30,0 %)<br>*народзіны*<br>*пагасціны*<br>*пераведы*<br>*роспыты*<br>*скокі* | Назвы свят, урачыстасцей, мерапрыемстваў, абрадаў і народных звычаяў<br>(17,9 %)<br>*жальбіны*<br>*шчадроўкі* | Назвы гульняў<br>(4,0 %)<br>*біткі*<br>*гарыпні*<br>*гарадкі*<br>*гарэлкі*<br>*даганялкі*<br>*хованкі* |
|---|---|---|---|

Таксанамічная карціна абстрактных plt

ЛІТАРАТУРА

1. *Архипкина, Г. Д.* Когнитивные основания и анропоцентрические параметры грамматической категории числа : дис. ... д-ра филол. наук : 10.02.19 / Г. Д. Архипкина. – Ростов н/Д., 2006. – 307 л.

2. Беларуская граматыка : у 2 ч. / Акад. навук Беларус. ССР, Ін-т мовазнаўства ; рэд.: М. В. Бірыла, П. П. Шуба. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985–1986. – Ч. 1 : Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск / А. І. Падлужны [і інш.]. – 1985. – 430 с.

3. *Брусенская, Л. А.* Семантический и функциональный аспекты интерпретации категории числа в русском языке : дис. ... д-ра филол. наук : 10.02.01 / Л. А. Брусенская. – Ростов н/Д., 1994. – 301 л.

4. *Дегтярев, В. И.* Категория числа в славянских языках: историко-семантическое исследование / В. И. Дегтярев ; отв. ред. Ф. П. Филин. – Ростов н/Д. : Изд-во Рост. ун-та, 1982. – 320 с.

5. *Забашта, Н. А.* Стилистическое использование форм множественного числа абстрактных имен существительных в русском и испанском языках (сопоставительный анализ) : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.02.05 / Н. А. Забашта. – М., 1984. – 20 с.
6. *Калинина, Л. В.* К вопросу о критериях выделения и отличительных приметах лексико-грамматических разрядов имен существительных / Л. В. Калинина // Вопр. языкознания. – 2007. – № 3. – С. 55–70.
7. *Колесников, А. А.* Семантическое обеспечение грамматических форм имен существительных русского языка / А. А. Колесников. – Киев : Выщ. шк., 1988. – 137 с.
8. *Конявская, С. В.* Семантическое словообразование в системе числа существительных: синхрония и диахрония / С. В. Конявская. – М. : РФК-Имидж Лаб, 2004. – 192 с.
9. *Наркевіч, А. І.* Назоўнік. Граматычныя катэгорыі і формы / А. І. Наркевіч. – Мінск : Выд-ва Беларус. дзярж. ун-та, 1976. – 245 с.
10. *Реформатский, А. А.* Число и грамматика / А. А. Реформатский // Вопросы грамматики : сб. ст. к 75-летию акад. И. И. Мещанинова / Акад. наук СССР, Ин-т языкознания ; редкол.: В. А. Аврорин., В. М. Жирмунский (отв. ред.) [и др.]. – Л. ; М., 1960. – С. 384–400.
11. Русская грамматика : в 2 т. / Акад. наук СССР, Ин-т рус. яз. ; редкол.: Н. Ю. Шведова (гл. ред.) [и др.]. – М. : Наука, 1980. – 2 т.
12. *Сенько, Е. В.* Неологизация в современном русском языке конца XX века: межуровневый аспект : автореф. дис. … д-ра филол. наук : 10.02.01 / Е. В. Сенько ; Волгогр. гос. пед. ун-т. – Волгоград, 2000. – 50 с.
13. *Соболева, П. А.* Словообразовательная полисемия и омонимия / П. А. Соболева // М. : Наука, 1980. – 240 с.
14. Теория функциональной грамматики: Качественность. Количественность / Т. Г. Акимова [и др.] ; редкол.: А. В. Бондарко (отв. ред.) [и др.]. – СПб. : Наука, 1996. – 264 с.
15. *Чередниченко, О. М.* Квазиабстрактные имена: позиционные условия плюрализации и прагматические характеристики : дис. ... канд. филол. наук : 10.02.19 / О. М. Чередниченко. – Ростов н/Д., 2002. – 154 л.
16. *Шапошников, В.* Русская речь 1990-х: современная Россия в языковом отображении / В. Шапошников. – М. : Моск. ассоц. лингвистов-практиков, 1998. – 242 с.